Кошт паштовай перасылкі аплачаны агулам.

Цана асобнага нумару 250.000 м.

ГОЛАС БЕЛАРУСА

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12, п. 6. (Wileńska 12 m. 6).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 3.000000 м.
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца.
Аплата надрукованага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 400.000 мк., сярод тэксту 300.000 м. і на 4 стр. 250.000 м., за радок пэтыту у 1 шп.

№ 20. Вільня, Серада, 16-га красавіка 1924 г. Год I.

Сяляне і работнікі, рыхтуйцеся да сьвяткаваньня 1-га мая.

Дзікі гвалт.

Дзікі скандал, зроблены правай половай польскага Сойму беларускаму паслу Тарашкевічу, зьяўляецца нечым бяспрыкладным нават для польскага парлямэнтарызму. Словы пратэсту проці меркаваньняў польскага імпэрыялізму, сказаныя з соймавае трыбуны прадстаўніком беларускага народу, былі заглушаны дзікімі крыкамі, бруднымі палаянкамі і пагрозамі „кулачнае расправы“ з боку эндэкаў, ашалеўшых ад злосьці, што знаходзяцца адважныя людзі, якія не баяцца прад усенькім сьветам сказаць *слова праўды*.

Мы разумеем дзікую ненавісьць польскае „правіцы“ да беларусаў. Разумеем, як гэтым паном баліць, калі гэныя самыя беларусы, перасьледаваныя і пазбаўленыя ўсіх грамадзкіх правоў у Польскай дзяржаве, *адным словам разьбіваюць іх ваяўнічныя пляны* і напамінаюць публічна, што Польшча, якая уціскае „свае“ меншасьці, ня мае права вымагаць нейкіх вялікшых правоў для палякоў у Літве, чым правы літвіноў, беларусаў і др. у Польскай Рэспубліцы. Але мы ня можам не запратэставаць самым рашучым спосабам проці *гвалту над свабодай дэпутацкага слова ў польскім Сойме*.

Дагэтуль такія гвалты бачылі мы з боку тых ці іншых агентаў адміністрацыі ў адносінах да беларускага сялянства, да беларускага слова—вустнага і друкаванага — тут, дома ў нас. Ну, дык-жа няма ніводнае польскае газэты, якая прызнавала-бы нашу адміністрацыю хаця-бы „здаваляючай“. Зусюль чутны згодныя галасы, якія востра кляймяць праціўную праву і законнасьці палітыку „крэсавых“ адміністратараў. І мы гатовы былі паверыць, што гэта запраўды дзеецца толькі затым, што нам насылаюць урадоўцаў з цэнтру, якія тамака, у сябе дома, ня могуць ужо служыць дзеля сваей—лёгка кажучы — „неадпаведнасьці“.—Гісторыя, якая разыгралася на засяданьні польскага Сойму 8 красавіка, паказвае, што гэткі пагляд—абмылковы. Яна паказвае, як глыбака ўелася ў душы польскага грамадзянства, у душы „найлепшых“ яго прадстаўнікоў тая *сыстэма вечных гвалтаў* над „інародцамі“, што *заглушае* нават у польскіх „сувэрэнаў“ *пачуцьцё права і законнасьці*, пазбаўляючы іх адначасна здольнасьці шанаваць чужыя перакананьні і чужыя ідэалы. „Хто інакш думае, чым мы,— той „здраднік“, той „правакатар“ і г. д.“ — кажуць гэныя „выбранцы“ большасьці польскага насяленьня....

Але скандал на соймавым засяданьні 8 красавіка ня толькі не запужаў беларускіх паслоў, ня толькі не заглушыў слоў грам. Тарашкевіча, а, наадварот, *зьвярнуў увагу ўсяго цывілізаванага сьвету як на істоту польскіх імпэрыялістычных дамаганьняў, так і на палажэньне беларусаў над уладай Польшчы*. Лепш-бы ўжо, паны, сядзелі вы ціха, калі ніводным словам не маглі запярэчыць заявам беларускага пасла! Мо' тады і выступленьне грам. Тарашкевіча не зрабілася-бы такім балючым для польскае нацыянальнае гордасьці, мо' прайшло-бы незаўважаным....

Польская „правіца“ сваім дзікім паступкам дала лішні доказ таго, як мала надзеі беларусы могуць ускладаць на польскі Сойм. І гэта йзноў хіба ня дасьць польскай дзяржаве ніякае карысьці: такая безнадзейнасьць, такое поўнае пераканаваньне, што ў Польшчы беларусу ждаць дабра ня прыходзіцца, можа толькі будзіць сярод нашага народу глыбокае абурэньне і кіраваць яго сымпатыі не да Варшавы, а ў зусім процілежны бок....

Праўда, ня ўвесь Сойм прыняў учасьце ў напасьці на грам. Тарашкевіча. Сацыялістычныя паслы нават пратэставалі проці павядзеньня п. маршалка Сойму, які перш дапусьціў да скандалу, а пасьля высказваў свой „жаль“ з гэтае прычыны. Але факт астаецца фактам: *у польскім Сойме беларускім паслом не даюць выпаўняць іх абавязкі*, дзеля якіх яны выбраны нашым народам. Беларускім паслом чуць-што ня фізычна *затыкаюць рот*, калі яны не згаджаюцца з польскай большасьцяй. На беларускіх паслоў „правіца“ *кідаецца з кулакамі*, калі голас нашых прадстаўнікоў пярэчыць іхнім аблыжным заявам аб польскім „раю для меншасьцяў“, хаця самыя гэтыя ўчынкі красамоўна гавораць, які гэны „рай“ на дзеле....

Эндэцкія гвалты над нашымі пасламі.

Прамова пасла Б. Тарашкевіча.

Пасол Дэмбскі ўнёс сьпешную прапазіцыю ў справе гвалтаў, чынімых літоўскім урадам над палякамі. Проціў сьпешнасьці выступіў пасол **Тарашкевіч**, які сказаў гэткую прамову, вельмі абурыўшую польскіх чарнасоценцаў.

Высокі Сойм! Унесеная прапазіцыя мае замер абвінаваціць Літву перад Лігай Народаў у прасьледаваньні польскай меншасьці ў Літве і адначасна, вінавацячы Літву ў нарушэньні міру на Ўсходзе Эўропы, заклікае Урад ужыць усе—можа нават ваенныя—спосабы, каб зьмяніць істнуючае палажэньне рэчаў у адносінах да Літвы.

Я ня маю спэцыяльнага захопленьня да сучаснага Літоўскага ўраду, якога адносіны да нацыянальных меншасьцяў запраўды зьмяніліся, здаецца ў горшы бок, але ад Літвы мы аддзелены кітайскім мурам, і ня знаем дакладна, што там дзеецца. Аднак, маем уражаньне, што закіды, якія зроблены ў сяньняшняй прапазіцыі проціў дзейнасьці літоўскага ўраду і грамадзянства, у кожным выпадку шмат збуйнены. (*Крыкі пратэсту*).

Але калі-б нават палова гэтых праступленьняў літоўскага ўраду была сьцьверджана, дык з поўным абурэньнем і пераканаваньнем мы падтрымалі-б гэтую прапазіцыю з тым толькі варункам, **калі-б яна была падпісана праз людзей і партыі, якія ў справе нацыянальных меншасьцяў тут, у сябе дома—ў Польшчы маюць чыстыя рукі і добрыя замеры.** (*Вокляскі на лаўках нац. менш. Голас на правіцы: „Каму ён тут робіць закід, што маюць нячыстыя рукі? Правакатар!“ Крыкі*).

Вы самі правакатары ўласнага народу і гісторыя вам гэта пакажа!

Маршалак (*звоніць*). Пасла, які па адрасу прамоўцы сказаў „правакатар“, толькі дзеля таго не магу прызваць да парадку, што ня вэдаю яго прозьвішча. (*Галасы на лаўках нац. менш.*: „Трус“! Крыкі).

П. Тарашкевіч: Калі-б у гэтай прапазіцыі заместа „Літва“ паставіць „Польшча“, дык мы-б атрымалі яўную праграму дзейнасьці падпісаўшых гэтую прапазіцыю партыяў у адносінах да нацыянальных меншасьцяў у Польшчы, а ў першую чаргу ў адносінах да меншасьцяў украінскай, беларускай і літоўскай.

Праграма гэтая зьмяшчаецца ў адным слове: **„зьнішчыць“**, а ў найлепшым разе ў двух словах: **„нішчыць і палянізаваць“. Згодна з гэтай праграмай паступалі і паступаюць дасюлешнія ўрады**, якія вышэйшую партыйную формулу модыфікуюць на вядомыя словы царскага міністра Сталыпіна: „сначала успокоеніе, а потом реформы“.

Вы робіце закід Літве, што не адчыняе новых польскіх школаў, **а што вы зрабілі з ужо адчыненымі школамі беларускімі, украінскімі і літоўскімі?** Робіце закід Літве, што эканамічна нішчыць польскую меншасьць. **А хто адбірае зямлю ад беларускага і ўкраінскага сялянства, садзячы на яго землях прыбышоў-асаднікаў!** (*Крыкі. Голас: Хто адбірае?*). **Хто тамуе і душыць разьвіцьцё ўсіх гаспадарчых украінскіх і беларускіх інстытуцыяў?**

Закідаецца Літве, што стасуе да польскай людгасьці палітыку гвалту і тэрору—**а ці-ж нязьлічаныя масавыя варварскія катаваньні нашага народу зьяўляюцца аздобай польскага імя?** (*Крыкі. Голас: Даволі гэтага! Біцьцё ў пюльпіты*). **Вы зьяўляецеся адказнымі за гэтыя гвалты і будзеце нясьці за іх адказнасьць яшчэ на гэтым сьвеце.** (*Крыкі. Галасы: Пане Маршалак, гэты чалавек прысягаў, а цяпер ламае прысягу. Біцьцё ў пюльпіты*)

Робіце закід Літве, што пад відам неатрыманьня літоўскага абыватэльства выкідае з межаў сваей дзяржавы грамадзян польскай нацыянальнасьці. Калі здарыўся гэткі выпадак, дык хіба толькі дзеля таго, што прыклады зьяўляюцца заражаючымі. (*Няўпынныя крыкі. Біцьцё ў пюльпіты*). Бо ці-ж ня польскі ўрад даў першы прыклад літоўскаму ўраду?

Абмінаю тут трываючыя дасюль высяленьні заграніцу грамадзян няпольскай нацыянальнасьці (*Крыкі. Голас: Рэнэгат! П. Глонбіньскі: Пан ня кажа аб сьпешнасьці, а толькі аб іншай справе*), якім на падставе Вэрсальскага трактату прыслугоўвае польскае абыватэльства—ўспомню калісь вядомую справу 33, калі выслалі 33 літвіноў і беларусаў (няўпыныя крыкі, біцьцё ў пюльпіты) і ніхто ў гэтай справе не пратэставаў, ані правіца, ані левіца.

Дык у найгоршым выпадку літоўскі ўрад ёсьць толькі добрым вучням польскага ўраду.

Пераходжу да справы пагрозы міру на Ўсходзе Эўропы праз Літву.

Запраўды, ня можна сказаць, каб павядзеньне Літвы ўмацоўвала пэрспэктывы міру. Але, запытаю, ці польская палітыка робіць усё, каб захаваць гэты мір? Сам рыжскі трактат, разьдзіраючы на часткі народ беларускі і украінскі стаўся падвалінай будовы, у якой сілай рэчаў накопліваецца выбуховы матар'ял. А найвялікшым пастаўшчыком гэтага матар'ялу зьяўляецца сьляпая шовіністычная палітыка дэнацыяналізацыі і зьнішчэньня таго, чаго зьнішчыць нельга — жывых народаў.

Калі хочаце міру—дайце магчымасьць жыць!

Урэшце, як-жа забаўным і дзіўным зьяўляецца зварот да Лігі Народаў з боку тых, якія з ёю ня лічацца і падрыхтоўваюцца да ануляваньня праекту аб нацыянальных меншасьцях.

Папросту з вуснаў вырываецца крык: medice, curafe impsum!

Прынцыпова падтрымліваючы патрэбу слушнай і разумнай абароны польскай меншасьці ў кожнай дзяржаве, лічу, што Польша павінна распачаць направу адносінаў у сябе дома.

Дзеля гэтага—на жаль — Беларускі і Украінскі Клюбы ўстрымаюцца ад галасаваньня. (*Вокляскі на лявіцы; крыкі на правіцы*).

Калі пасол Тарашкевіч сходзіў з трыбуны, на яго з лаянкай і крыкамі кінуліся польскія паслы з правага боку. Зараз-жа ў абарону падасьпелі беларускія і украінскія калегі. Чуць не дайшло да вострай бітвы. Але пасол Дэмбскі ўстрымаў эндэкаў, і ім бяз страты ўдалося зрабіць адступленьне.

Маршалак зачыніў на некалькі мінут паседжаньне.

Пасьля ўзнаўленьня паседжаньня некаторыя паслы, як P.P.S. Барліцкі, дамагаліся голасу з прычыны эндэцкага скандалу, але маршалак ня даў голасу ў гэтай справе.

З Польскага Сойму.

У часе дыскусіі аб буджэце выступалі ад беларусаў пасол Рагуля, а ад украінцаў — П. Васыльчук. Прамовы іх выклікалі з боку правіцы і цэнтру пратэсты і крыкі, бо праўда вельмі не падабаецца пястоўцам і хьене. Цікава, *што ў часе галасаваньня вызваленцы, якія выказаліся проціў буджэту, паціху ўцяклі з залі* і, такім чынам, яшчэ раз даказалі, што *яны гавораць адно, а робяць зусім іньшае.*

Пэпээсы выказаліся за буджэт і тым яшчэ раз выявілі свой запраўдны твар-дробнамяшчанскай партыі, якая падслугоўваецца буржуазіі.

Прамова пасла Б. Рагулі.

Высокі Сойм! Пан міністар скарбу запрапанаваў Сойму ўставу аб буджэце за час ад 1-га красавіка да 30 чэрвеня 1924 г. Не сумляваюся, што незалежна ад прамоваў, якія тут гаворацца, устава будзе прынята большасьцю галасоў і гэткім чынам урад зноў атрымае ўсе срэдствы, каб вясьці дасюлешнюю палітыку—**палітыку апалячваньня і колёнізацыі, палітыку гаспадарчага, культурнага і рэлігійнага ўціску беларускага і украінскага народу** і наагул нацыянальных меншасьцяў. Сёньняшняе галасаваньне пакажа, хто стаіць за інтарэсы беларускага народу, а хто проціў іх. Добра ведаю, што беларускі народ атрымае за гэтыя крывавыя грошы, якія з яго будуць сьцягваць, не карысьць, але **вайсковае асадніцтва**, заместа зямлі—ўзмацаваньне гэтага асадніцтва. Атрымае яшчэ **нагайкі ад паліцыі, катаваньне, шпіёнскія кулі** заместа прызнаньня грамадзкіх правоў. (*Голас*: Што гэта знача, шпіёнскія кулі?) Зараз вытлумачу. Ведаем, што беларускі народ будзе вазіць дрэва да староства, нават на патрэбы возьных староства і на адбудову будынкаў на пагранiччы, але ня будзе мець магчымасьці прывязьці дроў для сябе. Ведаем добра, што і далей народ беларускі будзе атрымоўваць заместа матар'ялу на адбудову квіты і зноў гэтыя квіты будуць адбіраць ад яго і **зноў будзе жыць у зямлянках і будзе гніць і марнець, як гніе і марнее цяпер.**

Ведаем, што заместа школаў і навучаньня ў роднай мове зноў будзе прыходзіць паліцыянт са штыхом пад вакно селяніна і казаць: „Ідзі, плаці 400.000 мк., што дня за тое, што ня хочаш пасылаць сына да польскай школы“. Я—пэдагог, маю 20 гадоў практыкі, тут таксама шмат ёсьць пэдагогаў і хай паны мне пакажуць хоць на адзін пэдагагічны аўтарытэт эўрапэйскі, які казаў-бы, што можна вучыць дзяцей ня ў роднай мове. Вось-жа, гэтыя кары будуць новай крыніцай даходаў для ўмацаваньня скарбу. Правая палова Сойму абвесьціла нам вайну. Прыймаем гэтае. Згаджаемся на вайну і на згоду, але ведаем, што вы, паны, ня хочаце йсьці на згоду. Дзеля гэтага ад імя Беларускага Клюбу заяўляю, што не баімося і ведаем на чыім баку праўда.

Я меў замер сказаць ураду і ягонай соймавай большасьці шмат няпрыемных рэчаў, але час маю абмежаваны, дзеля гэтага прымушаны да скарочанай крытыкі толькі Міністэрства Ўнутраных Спраў. Няма такіх слоў, каб можна было схарактарызаваць дзейнасьць органаў гэтага міністэрства на Ўсходніх Крэсах. Дзейнасьць гэтая можа і павінна ганьбіць ня толькі т. зв. разсаднікаў заходняй культуры, але нават бушмэнаў і готтэнтотаў.

Пан Глонбіньскі калісьці на паседжаньні Камітэту Абароны Крэсаў сказаў, што чужацкі элемэнт бяскарна грасуе на Ўсходніх Крэсах. Грасуюць элемэнты чужацкія і элемэнты польскія, і вось цяпер дам абраз, аб якіх казаў (*п. Станішкіс*: Польскі элемэнт грасуе ў Польшчы?! Як пан сьмее так гаварыць тут, дзе ёсьць польская дзяржава?) Знаю аб гэтым. (Голас на правіцы: пан знаходзішся ў Польскім Сойме). Хай пан пасол паслухае. Нічога ня робіце, дык хоць паслухайце нашых скаргаў. (П. Глонбіньскі: не абражай пан народу!) 18 лютага ў в. Хвоева, Пагарэльскай гм., Несьвіскага пав. было сялянскае вясельле. На гэтае вясельле прышоў, як госьць, пастарунковы, але—можа праз дурноту — з карабінам. Карабін паставіў і сеў спакойна. Раптам урываецца трох вывядоўцаў сьледчай экспозытуры і да яго: „давай карабін“. Ён кажа: „не магу“... Пасьля дастаюць з кішаня рэвальвэры і пачынаюць страляць у хаце і гэты чалавек быў ранены ў калена і ляжыць цяпер у шпіталі. Яшчэ больш цікава, што на маю інтэрвэнцыю ў Нясьвіскага старосты п. Чарноцкага, чаму ён дазваляе на гэткія рэчы, ён адказаў, што гэта чужацкі элемэнт, ня польскія грамадзяне, бандыты. Гэта ўласныя яго словы. Трымаюць у карна-сьледчай экспозытуры бандытаў на пасадах вывядоўцаў. І гэта ня вынятк і, але масавае зьявішча, як вынік кірунку польскай палітыкі, маючай на мэце поўнае зьнішчэньне беларускага народу. **Пяцігадовае ўрадаваньне Польшчы на нашых землях зрабіла больш інвалідаў, чым сусьветная вайна**, я сьмею гэта сьцьвердзіць.

Дамагаемся спыненьня катаваньня праз паліцыю беларускага народу. Дамагаемся неадкладнай рэгістрацыі інвалідаў, ахвяраў гэтага тэрору і выдачы ім дзяржаўных эмэрытураў (пэнсіяў), бо дзяржава нясе адказнасьць за гэткую дзейнасьць сваіх урадоўцаў. Дамагаемся, каб змусіць камісію да дазнаньня аб надужыцьцях адміністрацыі на Усходніх Крэсах, каб распачала працу на мяйсцох. Ужо год, як выбрана гэтая камісія, а яна дасюль нідзе не выяжджала. Я катэгарычна пратэстую проціў таго, каб старшыня гэтай камісіі, пасол Тугут браў лекцыі італьянскага фашызму ад Мусоліні тады, калі наш народ топіцца ўва уласнай крыві.

Але на ўсё ёсьць канец. Прыдзе канец і цярплівасьці беларускага народу. З поўнай сьвядомасьцю адказнасьць за ўсё гэтае складаем на польскае грамадзянства і польскі ўрад. Перад рэвалюцыяй у Расеі казалі: В Росии нет закона, есть столб, а на столбе—корона. У Польшчы і гэтага няма; няма нават і таго слупа, на якім можна было-б бачыць, што ў Польшчы пануе права, у Польшчы пануе толькі гвалт. Што мы бачым на крэсах? бачым рабункі, разбоі і ўсе атрыбуты таго, што вы, паны, завеце культурай на ўсходніх крэсах, а я мог-бы назваць толькі гвалтам і варварствам.

Вось-жа, калі стасуецца палітычнае праступленьне адносна беларускага народу, дык мы ня можам ухваляць гэтаму ўраду крэдыты і будзем галасаваць проціў буджэту.

Бэсарабскае пытаньне.

Як ведама, расейска-румынскія перагаворы ў Вене сарваліся на справе Бэсарабіі, якую яшчэ ў 1918 г. захапіла аружнай сілай Румынія. Цяпер Румынія адмовілася перадаць усю справу на вырашэньне самаму насяленьню—шляхам плебісцыту, — як дамагалася радавая дэлегацыя. Адносіны паміж Румыніяй і Радамі вельмі абвастрыліся, з прычыны гэтага. Старшыня румынскай дэлегацыі заявіў прадстаўнікам прэсы, што Румынія гатова бараніць сваі граніцы нават з аружжам у руках...

З другога боку, Літвінаў заявіў, што Румынскі ўрад добра ведаў аб тым, што на канфэрэнцыі будзе паднята справа Бэсарабіі, і адмовіўся абмаўляць яе толькі пасьля адабрэньня захвату з боку францускага парлямэнту. Дзеля таго галоўная віна за сарваньне перагавораў ляжыць на Францыі. Але важна ўжо і тое, што ўся Эўропа цяпер ведае добра, што гэтая справа—ня вырашана і ня можа быць вырашана проці волі Радаў... Францыя і Англія яшчэ пашкадуюць, што пасьпяшылі прызнаць захват... Гэтая справа будзе аднэй з найважнэйшых на савецка-ангельскай канфэрэнцыі ў Лёндыне...

Наагул, закончыў Літвінаў, усе дзяржавы, як вялікія таксама і малыя, павінны зразумець, што, падтрымліваючы румынскія захваты, яны тым самым прымаюць пэўны ўдзел у „захваце тэрыторыі СССР“...

З гэтых заяваў відаць, што ўся справа можа выклікаць вайну.

А што значыць вайна пажіж Румыніяй і СССР, кожны добра эразумее: — Румынія зьвязана ваенным саюзам з Польшчай, Польшча з Францыяй і гэтак далей... З сваяго боку СССР таксама можа знайсьці саюзьнікаў...

Сьмерць нямецкага мільярдэра Штынэса.

10/IV памёр у Бэрліне фінансавы дыктатар, запраўдны „некаранаваны кароль“ Нямеччыны, якому прыналежала некалькі магутных трэстаў, каля сотні газэтаў і г. д.

Зьезд „крэсовых“ ваяводаў.

10/IV пачынаецца ў Варшаве зьезд крэсовых ваяводаў... Ці можна чакаць ад паноў ваяводаў чаго лепшага для нашага сялянства? Як мы ведаем з пастановаў Рады Міністраў, маюць быць, толькі навострэны рэпрэсіі—школьныя і адміністрацыйныя.

Вынікі выбараў у Фінляндыі.

Пакуль што высьветліліся гэткія вынікі выбараў у Фінляндзкі Сойм, сацыял-дэмакраты атрымалі 121.000 галасоў; нацыянальны фінляндзкі блёк 57.000 галасоў; агроры—67.000 галасоў; швэды—52.000 галасоў; камуністы — 46.000 галасоў; прагрэсысты — 38.000 гал.

Ізноў бомбы ў Варшаве.

У Варшаве ў нейкага Войцехоўскага паліцыя выкрыла цэлы склад, бо аж 23 бомбы!..

Падвышэньне зямельнага падатку.

У хуткім часе прэзыдэнт мае выдаць дэкрэт аб падвышэньні падатку ад грунтаў.

Барацьба з камунізмам.

Соймавы клюб эндэкаў унёс у Сойм прапазіцыю, заклікаючую ўрад да як найвастрэйшай барацьбы з антыдзяржаўнай агітацыяй камуністаў, не шкадуючы нават паслоў Сойму.

Сынод праваслаўных „япіскапаў“.

У Варшаве пачалася сэсія варшаўскімі ўраднікамі праваслаўнага Сыноду. Усе паробленыя п. п. Цекарскім і Стромкоўскім „япіскапы“ „лагодна і пагодна“ зробяць усё, што загадае польскі ўрад—бяз усялякай „опозіцыі“.

Палітычныя падзеі.

Адказ пасла Тарашкевіча эндэкам.

На паседжаньні Сойму 10 красавіка пасол Тарашкевіч узяў слова, каб адказаць эндэцкім крыкунам на закід у рэнэгацтве.

„У часе апошняй маей прамовы чуваць былі крыкі „правакатар і рэнэгат“. На горшы не адказваю, бо справа маршалка рэагаваць на непарлямэнтарныя выразы.

Што да зьмены палітычных паглядаў, а нават нацыянальнай сьвядомасьці, абы толькі ў згодзе з уласным сумленьнем, дык гэта няможа лічыцца дрэнным; асабліва зразумелай зьяўляецца гэткая мэтаморфоза ў нашых стасунках, з прычыны стыхійна прабуджаючайся сьвядомасьці народаў беларускага, украінскага і літоўскага. Я нікому не раблю закіду, што лічыць цяпер сябе за паляка, хоць мае продкаў жыдоў ці немцаў (*Галасы*; *Строньскі*!)

Я заўсёды быў беларусам і беларусам называў сябе; паходжу з сялянскай сям'і і да 12 году жыцьця ня знаў іншай мовы, апрача беларускай. Праўда, браў учасьце ў польскім незалежніцкім руху, але заўсёды, як беларус. (*Вокляскі на лявіцы*). Затое ніколі ня быў расейскім урадоўцам, але навукова працаваў пры пецярбургскім унівэрсытэце і не хаваю маей сымпатыі да расейскай навукі. Шмат палякаў знае мяне з школьнай лавы, як беларуса.

Выбары ў Баварыі.

Вынікі выбараў у баварскі Сойм—гэткія: баварскія людоўцы атрымалі—30 мандатаў; Людовы Саюз—16; аб'яднаныя нямецкія сацыялісты—14; саюз сялянскі—7 ці 8, камуністы—7, аб'яднаныя нацыяналісты, Нямецкі Блёк і іншыя правыя групы разам—10 ці 11.

Газэты дапушчаюць, што паражэньне людоўцаў пацягне за сабою адстаўку габінэту Кніллінга.

Радавы дэлегат у Кракаве.

Да Кракава прыехаў народны камісар Ганэцкі, камандыраваны туды радавым урадам, каб сабраць усе магчымыя матар'ялы, датычучыя пабыту тутака Леніна ў 1912 і 1913 г.г.

Як жывяцца абшарнікі каля скарбовага каравая...

Работніцкі „Przegląd Gospodarczy“ паказывае ў красамоўных лічбах, як пражорліва аб'ядалі абшарнікі дзяржаўны скарб, карыстаючыся сваім хьенскім урадам і сыстэмай так званых „крэдытаў“... —

У траўні і чэрвені арганізацыі абшарнікаў атрымалі ад сваяго „эканома“ ў урадзе „на жніво“ ўсяго „крэдытаў“ на 3 міль. 163 тысяч злотых, якія павінны быць зьвернуты скарбу праз 3 месяцы, але, зразумела, па курсу дня ўплаты.

Але тадышні „эконам“ Кухарскі, сьцягнуўшы неяк з абшарнікаў у палове кастрычніка толькі каля 400 тысяч злотых, а рэшту — 2 мільёны 764 з паловай тыс. злотых—адлажыў ім аж да канца году...

Але штука—ў тым, што ён тады-ж перарахаваў гэтыя злотыя на польскія маркі, што стварыла суму ў 92 мільярды 351 мільён мар.

І вось гэтую суму ў марках -па курсу злотага ў кастрычніку, абшарнікі вельмі лёгка і заплацілі скарбу 31 сьнежня, калі ўся сума гэтых марак варта была ўжо ня 2.764.500 злотых, але толькі 75.000....

Гэтак значыць, што абшарнікі разам з Кухарскім, проста кажучы, абакралі скарб — дзіва, што „ўкаханай ойчызны“!—больш як на 2 з паловай мільёны злотых...

З гэтага прыкладу кожны зразумее, як выгадна, ня кажучы аб чым іншым, было абшарнікам і прамыслоўцам, якім „свой“ урад рабіў такія-ж падарункі, як выгадна было ім усім руйнуючае працаўніка падзеньне маркі... і дзеля чаго іхні ўрад „ня мог“ устрымаць гэтага пастаяннага спадку...

Перамога нямецкіх чыгуншчыкаў.

Нямецкі ўрад прыняў усе дамаганьні чыгуншчыкаў. Гэткім чынам, агульная забастоўка ў Нямеччыне больш не пагражае.

Аканчальны склад італьянскага сойму.

Як паведамляюць газэты, у новым італьянскім парлямэнце будзе шмат фашыстаў (ці наагул урадовай большасьці)—374 пасла, сацыялістаў усіх сартоў разам з камуністамі—65; пополяраў (людоўцаў)—39; дэмакратаў абедзьвюх групаў—30; групы канстытуцыйнай опозіцыі—12; рэспубліканцаў—7; славянаў—4; сялянск. партыі—3; і 2 сардынца.

З газэт.

Польская прэса аб соймавым скандале.

Паступовая прэса глыбока абурана напасьцяй „правіцы“ на пасла Тарашкевіча, прамаўляўшага з соймавае трыбуны.

„Kurjer Poranny“, з іроніяй адзначыўшы „роблены“ энтузіязм Сойму ў справе выступленьня проці Літвы, гэтак кажа аб прамове п. Тарашкевіча:

> Пачаў ён гаварыць у форме зусім прыстойнай, спакойным голасам, што паступаньне ковенскае Літвы ў адносінах да нацыянальных меншасьцяў мала розьніцца ад адносінаў нашае ўлады да меншасьцяў у Польшчы.... Пададзеныя ў апошніх часох і разгляданыя ў сойме *запросы і сьпешныя прапазіцыі аб палітыцы на Крэсах, беззаконныя арышты, гвалты, біцьцё ў сувязі з поўнай нядбайнасьцяй аб дабрабыт беларускага і украінскага насяленьня даводзяць, што ў нас ня дзеецца добра, і разжалены пасол меў пэўныя падставы выказаць гэткі пагляд на справу.*

„Карчэмны скандал“ газэта прыпісывае толькі „тупасьці мысьлі“ польскіх нацыяналістаў, ды адзначае, што ён павінен паказаць ураду,

> што трэба раз урэшце ўпарадкаваць справу Крэсаў,

а такжа павінен быць яркім доказам для „так званае польскае лявіцы“, што

> яна павінна свае шумныя праграмы аб нацыянальнасьцях праводзіць у жыцьцё. Нельга далей хаваць галаву ў пясок, тлумачучы гэта санацыяй скарбу і паўпамоцтвамі ўраду.

„Kur. Por.“ пры гэтай нагодзе зварачае ўвагу і на тое, што

> калі справа датычыцца беларусаў, дык радавы ўрад выгрывае іх проці Польшчы; ён стварыў Беларускую Радавую Рэспубліку, і чым больш уціскае беларусаў і выяўляе сваю нядбайнасьць аб іх адміністрацыя ў нашай Беларусі, тым вялікшую палітычную і культурную волю даюць Рады ў сябе, вытвараючы аўтаматычна няпрыязнае да Польшчы настраеньне.
>
> *Уціскам і сілай нельга дэнацыяналізаваць*: мы ведаем гэта з уласнае нядолі; тым больш нельга называць пасла правакатарам за тое, што ён легальна ў сойме дамагаецца права разьвіцьця для свайго народу.

Прыраўнаваўшы, урэшце, гвалты, якія старая Польшча чыніла над іншаверцамі, газэта раўнуе іх з сучаснымі гвалтамі над меншасьцямі ў новай Польшчы і напамінае, што справу іншаверцаў у Польшчы раз ужо разьвязалі... расейскія войскі!

Падобным-жа спосабам асьвятляе скандал у Сойме і „Kurjer Polski“ ды некаторыя іншыя часопісі, зыходзячыся ў асноўных думках з прыведзенымі вышэй. Затое эндэцкі лейб-орган „Gazeta Warszawska“, каб неяк затушаваць кампрамітацыю Польшчы перад усім сьветам, кінулася на хітрыкі, з якіх відаць яе поўную бязраднасьць. Прывёўшы словы украінскага пасла Васыньчука, які сказаў:

> Справа нацыянальных меншасьцяў павінна выплыць на форум Лігі Нацыяў. Экстэрмінацыйная палітыка п. Грабскага ў адносінах да украінцаў творыць на ўсходзе выбуховы матар'ял. Разьвязаньне нацыянальных і тэрыторыяльных пытаньняў мірнай дарогай робіцца ўсё менш магчымым. Можа дайсьці да аружнага канфлікту.

эндэцкая газэта, зьвязаўшы з гэтай справай і беларусаў, піша:

> Ані п. Васыньчук, ані п. Сяргей Казіцкі ці Тарашкевіч не зьяўляюцца прадстаўнікамі украінскага ці беларускага народаў дзеля тае простае прычыны, што колькігадовай (?!) агітацыяй, хоць-бы падтрыманай акцыяй улады (???), ня творацца „народы“. Нацыянальныя меншасьці на Усходніх Крэсах складаюцца з бязыменных этнічных груп, якія нават у найменшай меры ня маюць нацыянальнае сьвядомасьці.

Адным словам: *беларускага і украінскага народаў няма*! Няма, значыцца, і нацыянальнага уціску,—і ўсё ў парадку! Газэта заклікае ўрад, каб і далей дзяржаўся такога пагляду....

З такім *ідыатызмам* мы вясьці спрэчкі ня будзем. Жыцьцё адкажа за нас....

З УСЯЕ БЕЛАРУСІ.

ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ.

ХРОНІКА.

У Беларускім Нацыянальным Камітэце ў Вільні. Вызначаны на 14 гэтага красавіка Агульны Сход Нацыянальнага Камітэту ў Вільні не адбыўся з прычыны адсутнасьці кворуму і дзеля гэтага перанесены на 16 красавіка а 5 гадз. вечара у памешканьні Ц. Б. Шк. Рады (Віленская 12, п. 6).

Зацьверджаньне статуту Польска-Беларускага Таварыства. Міністэрства Унутраных спраў паведаміла Дэлегатуру Ураду ў Вільні, што прадстаўлены ў Міністэрства статут Польска-Беларускага Таварыства зацьверджаны.

Арганізацыйны сход новага таварыства мае адбыцца ў хуткім часе, магчыма нават перад Вялікаднем.

Школьная справа на Крэсах. У сувязі з абгаварэньнем цяпер у Радзе Міністраў справы Крэсовых ваяводзтваў, выехаў да Варшавы Куратар Віленскага Школьнага Вокругу п. Гонсёроўскі на зьезд ваяводаў і куратараў Усходніх Крэсаў.

Беларускія зьезды. На аснове пастановы Беларускага Пасольскага Клюбу ад 9/IV 1924 г., у бліжэйшым часе адбудуцца зьезды прадстаўнікоў беларускага сялянства паветаў: 1. Баранавіцкага—4 мая ў Баранавічах; 2. Лідзкага—4 мая ў Лідзе і 3. Наваградзкага—22 мая ў Наваградку.

На гэтыя зьезды зьявяцца беларускія дэпутаты і сэнатары і дадуць справаздачу аб сваей працы ў Сойме і ў Сэнаце.

Кожная вёска павінна прыслаць на зьезд сваіх прадстаўнікоў—ад вялікіх вёсак па 2, ад меншых па 1. Мястэчкі па 3—4 і больш.

Аб памяшчэньні, у якім адбудуцца зьезды ў кожным з памянёных гарадоў, будзе абвешчана асобна.

Дэпутат С. Баран захварэў. Як нас паведамляюць, беларускі дэпутат Сяргей Баран, які ня будучы выдадзены Соймам—быў заарыштаваны і пасаджаны ў турму, знайходзіцца за зялезнымі кратамі ўжо ў працягу 10 месяцаў. Сядзіць цяпер ён у Горадзенскай турме, дзе захварэў на лёгкія і на рэўматызм; зусім схудаў, памізарнеў, ногі апухшы.

Беларусы ў турмах па 22 месяцы бяз суду. У Горадзенскай турме сядзіць 30 чалавек партызанаў беларусаў і літвіноў—сьледзтва якіх цягнецца ўжо 22 месяцы і дагэтуль судовай расправы ня было. Усе гэтыя падсьледчыя—сыны вескі, людзі маладыя, марнеюць у турме, чакаючы суда.

Раскол сярод віленскіх пэпэсаў. У Віленскай арганізацыі P. P. S. адбыўся раскол. Левае крыло гэтай арганізацыі на чале з Заштовтам, Годводам і Буйко выдзелілася ў асобную групу. Выдадзены новай групай нумар партыйнай часопісі „Praca“ ўладаю сканфіскаваны.

У Беларускай Драматычнай Майстроўні. У нядзелю, 13 мінулага красавіка адбыўся агульны сход сяброў і працаўнікоў Т-ва, скліканы з прычыны пачатку вялікодных вакацыяў, у часе якіх Майстроўня працаваць ня будзе. Сход адчыніў Старшыня Т-ва грам. Антон Трэпка. Справаздаўчы даклад аб дзейнасьці за першы пэрыяд (люты—сакавік) зрабіў Дырэктар Майстроўні грам. Мікола Красінскі. Потым са словам прывітаньня выступіў грам. Антон Луцкевіч, які адзначыў вялікую ролю Майстроўні ў справе беларускага адраджэньня. Дырэктар Майстроўні Франціш Аляхновіч зьвярнуўся з цёплым словам да працаўнікоў Майстроўні, выказаўшы сваё задаваленьне працаваць з Моладзю.

Старшыня Т-ва агаласіў пісьмо, якое атрымана на імя Т-ва ад зяця вядомага беларускага артысты Ігната Буйніцкага, грам. Нікіфароўскага з шчырым прывітаньнем і жаданьнем пасьпешнага разьвіцьця працы Т-ва. Сход, уважна выслухаўшы гэтае пісьмо, ушанаваў памяць Ігната Буйніцкага ўставаньнем.

Усе закранутыя пытаньні абгаворываліся за шклянкай гарбаты, якая была зарганізавана супольнымі сіламі працаўнікоў Майстроўні. Адчувалася, што сабралася адна сям'я, ахопленая аднымі імкненьнямі, якая шчыра аддалася сваёй працы. Пасьля гарбаты наладзіўся экспромтам імправізаваны канцэрт—паўтарылі №№ пяяньня і дэкламацыі, найбольш удала споўненыя на адбыўшыхся вечарох Майстроўні.

Прысутныя, якія звычайна заняты працай ў часе спэктакляў і канцэртаў, мелі магчымасьць пабыць глядзеньнікамі і слухачамі свае супольнае працы. Кожны з працаўнікоў адпачываў і весяліўся.

Сход закрыўся а 10 гадз. ўвечары.

Праца Майстроўні аднавіцца ў нядзелю, 4 траўня чарговай лекцыяй А. Луцкевіча. Пасьля лекцыі—канцэрт і скокі.

З Наваградку.

7-га красавіка адбыўся ў Наваградку агульны сход „Таварыства Беларускае Школы“, на якім былі прысутнымі сэнатар Уласаў і дэпутат Рак-Міхайлоўскі. Выбраны новы Урад Таварыства, якому даручана сходам апякавацца Беларускай Гімназіяй у Наваградку і клапаціцца аб адчыненьні ў Наваградзкім павеце беларускіх пачатковых школ, бо да гэтага часу ў Наваградзкім павеце польская ўлада не адчыніла ані воднай беларускай школы, ня гледзячы на тое, што ў нашым павеце беларуская люднасьць сплошнай масай. У склад Ураду „Таварыства Беларускае Школы ў Наваградку“ і Наглядная пры ім Рады абраны вучыцелі, адвакаты, сяляне і былы земскі дзеяч.

Аб місіі беларускае моладзі.

Наш беларускі народ?...

Што можа даць ён у скарбніцу агульначалавечай культуры, што можа ён выявіць?...

Ці адшукае ён сваю „кветку шчасьця“, ці ачаруе сваім творчым геніем неаб'ятныя абшары беларускае зямлі-цаліны?

Ці разьляціцца па сьвету яго крылатая думка?..

Так. Ёсьць аб чым падумаць цяпер нам, беларусам, асабліва моладзі...

Бо стаімо мы перад будучынай нашай, перад таёмнасьцю нашага лёсу. Стаімо перад днём новым, даўно чаканым, перад бурным этапам нашае гісторыі.

* * *

— „Пабачым, ці здольны палякі стаць народам“—сказаў калісьці Наполеон.

Больш ста гадоў ужо прайшло з таго часу, калі гэтае ракавое запытаньне стаяло перад польскім народам так, як яно стаіць цяпер перад намі, беларусамі.

І што-ж мы бачым?... З болью ў сэрцы мы павінны прызнаць, што польскі геній не сказаў яшчэ свайго слова, не счараваў яшчэ сваімі праменьнямі ні працоўных грамадаў польскіх — ні тым болей нас, блізкіх суседзяў польскае нацыі.

Парэзаны калісьці на часткі, як і мы цяпер, польскі народ выявіў пэўную энэргію ў барацьбе за сваю волю, за незалежнае нацыянальна-дзяржаўнае істнаваньне.

Адно за другім, цэлы шэраг пакаленьняў змагаліся пад слаўнымі штандарамі вызваленьня народаў, пад гаслам „За нашу і вашу вольнасьць“! Лепшыя сыны польскага народу гінулі ня толькі на мураўёўскіх шыбеніцах, у вастрогах і тундрах Сібіры, але і на барыкадах у Парыжы...

Поўная драматызму барацьба польскага народу знайшла сабе геніальны адбітак у польскай літэратуры і польскім мастацтве.

Здавалася, што польскі геній ідзе да свае вышыні і дасьць пэўны прыклад іншым паняволеным суседнім народам, пакліча іх на барацьбу...

І што-ж цяпер бачым?..

Замест волі народаў у сучаснай Польшчы — бачым страшэнны нечалавечны ўціск нацыянальных меншасьцяў, сярэднявяковую інквізыцыю ў вастрогах...

Украінскі нацыянальны рух у межах Польшчы носіць ўжо выразны характар фанатызму. Тое-ж самае будзе і з беларускім рухам, калі аб'ектыўныя ўмовы ня зьменяцца...

Паўстанцы, якія палажылі сваё жыцьцё за вызваленьне народаў, перавярнуліся-б у сваіх сьвятых магілах, каб пабачылі, што робіцца цяпер у Польшчы.

Само сабою, мы ня хочам вінаваціць у гэтым агулам польскі народ. Польскія рабочыя і сяляне, ад якіх менш за ўсё залежыць польская сучаснасьць, не нясуць адказнасьці за яе, за ўсё зло, што б'е фантанам з дзяржаўнае і адміністрацыйнае крыніцы...

Будзем верыць, што польскі народ, пабачыўшы запраўдны стан рэчаў, унясе пэўныя „папраўкі“ да гэтае сучаснасьці... Хочацца верыць, што польскі геній падымецца яшчэ высока працоўнымі рукамі і счаруе нас.

Але гэта можа быць толькі заўтра...

* * *

А сягоньня?.. Чаму мы павінны вучыцца сягоньня ў палякоў?! Што павінны забраць і што павінны рашуча адкінуць?..

Само сабою, што слаўныя традыцыі польскага паўстаньня за волю народаў мы павінны ня толькі шанаваць. Глыбока ў сваім сэрцы мы павінны захаваць іх спадчыну. Каханьнем і лягендаю мы павінны абкружыць памяць герояў Волі, піянераў рэвалюцыйнага руху ў нашай краіне.

А польскую сучаснасьць? Адкіньмо яе. Бо яна павінна быць для нас вечным прыкладам, чаго ня трэба рабіць народу, калі ён стане на шлях дзяржаўнага будаўніцтва...

* * *

Адкіньмо сучасную дзяржаўную польскую доктрыну тым болей, што стаім мы перад днём новым... Вэрсальскія слупы, на якіх пабудавана сучасная Эўропа, гніюць. Ня сяньня—заўтра яны рухнуць. І ў гэты час мы павінны быць гатовымі.

Мы, заходнія беларусы, пераживаем цяпер самы трагічны этап свайго жыцьця... Запраўдная здань сьмерці лётае над намі. І заданьнем нашым зьяўляецца сабраць усе сілы нашы, каб пратрымацца да дванаццатае гадзіны. Вадзёрасьць, моцны дух наш павінен адхіліць той меч, які занесен над нашым жыцьцём. Мы павінны дачакацца тэй хвіліны, калі сканае Вэрсальская Эўропа.

* * *

Нашая воля. Ці дачакаемся, ці даб'емся?

У вялікіх муках радзілася яна на сьвет. Пад рокат гарматаў і ў завіруху рэвалюцыі прыйшла да нас ідэя нашае дзяржаўнасьці, маладая чараўніца адраджэньня.

— Воля! Воля!...

Як Прамэтэеў агонь, мы шануем яе. Мы нясьлі і нясем яе цярністым шляхам барацьбы.

Гэта яна склікае, злучае беларускі народ там, на Ўсходзе! Гэта яна ўздымае нашы сілы тут, на Захадзе... Гэта яна асьвятляе шлях маладому беларускаму пакаленьню.

Глядзеце! На зьмену піанерам барацьбы выйшла ўжо маладая раць змаганьнікаў. Не бяда, што яны ў сьвітках зрэбных, у сьвітках палатяных... Змагацца ёй ня страх. Бо б'ецца неўстрашымае сэрца ў грудзёх, бо красуе крылатая думка...

Моладзь Беларусі! Колькі радасьці, колькі лепшых надзей яна абуджае! Дубы — а ня хлопцы. Ніякія сілы пякельныя ня стрымаюць іх.

І калі трэба ісьці далей—пойдуць.

Калі трэба данесьці да канца агонь вызваленьня—данясуць!

Вось першы акт нашае нацыянальнае і рэвалюцыйнае місіі.

А далей?.. Можа, на другі дзень волі спачыць духам. О, гэта была-б самая вялікая памылка! Наш нацыянальны геній сялян і работнікаў беларусаў павінен будзе цьвісьці радугаю і счараваць ня толькі нас. Наша гаспадарка, наша думка, наша песьня, наша літэратура — ўсё нашае жыцьцё павінна будзе закрасаваць купальскімі кветкамі, кветкамі вясны і маладога шчасьця, і тады можна будзе сказаць: „Так, Беларусы здольны быць народам“.

В. В—ій.

Весткі з вёскі.

Панская лісіца і мужыцкая кошка.

(М-ка Вязынь, Вялейскага пав.).

У абшарніка Гічэвіча хтосьці ўкраў прыручаную лісіцу. Падазрэньне пала на аднаго хлапца, які служыў у дварэ. Узялі хлапца на пастарунак для дапросу і там яго так білі, так зьдзекаваліся, што ён і роднага-б бацьку абгаварыў, а ня толькі сваіх знаёмых з другога фальварку. Злавілі і тых двух і таксама дапрасілі і „дошкай“, і „канчукамі“, і „сьвінцоўкай“, і патроны клалі паміж пальцаў, і вось, гэткім чынам, дазналіся „праўды“: будуць абвінавачанымі і судзіць будуць. Прыгэтым усе паліцыянты, як кажуць людзі, былі надта п'яныя і, каб ня было сьведкаў, дык людзей, што ў той час на пастарунку сядзелі пад арыштам па прыгавору пакаёвага судзьдзі, паліцыянты выгналі вон ноччу на вуліцу, а на другі раз зусім адпусьцілі начаваць да суседніх жыхароў.

Напіўшыся да няпрытомнасьці, паліцыянты любяць рабіць паляваньне. Але ўжо сабак не хапае, дык страляюць кошак. Гэтак забіў кошку жыхара м-ка Вязынь Д. М. паліцыянт Балаховіч, але шкуры ня зьняў, а толькі павесіў забітую кошку на кол.

Калі-ж палепшае нашае жыцьцё? Цяжка і цёмна. Да нас і нашыя паслы ня едуць. Толькі і зналі іх, калі выбіралі, а цяпер мы забыліся іх, а яны нас. Трэба, панове паслы, завітаць і ў наш куток.

С. Саха.

Асаднікам добра, а нам дрэнна.

Слонімшчына.

З урадовых польскіх крыніц вядома, што на беларускіх і украінскіх этнографічных землях, т. зв. „Kresach Wschodnich“, населена 9.000 польскіх асаднікаў, вайсковых колёністаў. Зямлі ім усім надзелена 350.000 дзесяцін.

Некаторыя з гэтых „chłopców malowanych“ пана Пілсудзкага пачалі загаспадароўвацца, засноўваць у павятовых местах і мястэчках свае „współdzielni związku osadników wojskowych“.

Як гэтыя „моцныя“ гаспадары вядуць сябе ў адносінах да мяйсцовае беларускае людпасьці, ужо ня раз пісалася ў нашых газэтах. Бо ведама—ён, асаднік, пан ды яшчэ і з аружжам; ён — былы ваяка, дык і трымаецца як ў заваяванай зямлі; ходзіць папанску, гаворыць папанску ды і працуе папанску. Шмат хто з нашай беднаты беларускай, малазямельных нашых і безьзямельных сялян прымушаны, каб так-сяк пракарміцца, наймацца на працу да гэтых новых паноў, браць на запашку ад іх зямлю.

Нашаму Слонімскаму павету, мусіць, найбольш пашчасьціла. Мысьлю я, што ў параўнаньні з другімі паветамі мы маем тут найбольш паноў-асаднікаў. У некаторых мяйсцох нашага павету дык сядзяць яны цэлымі кучамі. Мусіць яны сяліліся гэтак для большай сьмеласьці і ўласнага спакою. Так, у аколіцы мястэчка Бытэнь з абшараў двара Плянты, што недалёка ад станцыі Дамашова, асаднікам прыдзяліла польская ўлада 3.500 дзесяцін зямлі і зямлі не абы-якой. Села тут да 150 асаднікаў вайсковых, якія маюць і сваё-ж вайсковае начальства—падафіцэраў і афіцэраў; апошнія дасталі большыя надзелы зямлі за звычайных жаўнераў; нават сялібы іх маюць багацейшы выгляд. Значная частка гэтых асаднікаў ужо пабудавалася; з вакна вагона бачым, што па абодвух баках лініі чыгункі параскіданы іхнія будоўлі. І лічаць яны выгадным для сябе блізкасьць чыгункі, бо трэба-ж ведаць, што Урад дае іх ім льготны праезд.

Шчасьлівыя людзі, дальбо, гэтыя асаднікі: хоць паваявалі, праўда, але заваявалі сабе добрай зямлі і па добрым кавалку, бо аж па 25—30 дзесяцін на кожнага і маняцца добра сабе жыць, а наш брат, якога толькі ў абоз хваталі, дык і дагэтуль марнее на сваіх 2—5 дзесяцінках зямлі, нараскіданай у 5—7 шнурках. Бяда ды і толькі! А колькі было зьнішчана ў нас вёсак! І дагэтуль людцы нашы ніяк ня могуць вымаліць сабе лесу на адбудову, жывуць у зямлянках, хварэюць, мруць дзеці нашы. А як асаднікам, дык ім неяк адразу ўдалося і дрэва на будынкі дастаць і грошы на загаспадараваньне.

Ну і ня дзякуюць-жа ім нашыя старыя паны; на гэтых старых нашыя бацькі паншчыну адраблялі і ўсе мы, прызнацца, надта квапіліся на гэтую зямлю. Ажно тут, вот табе і на! І ад іх адабралі і нам ня далі.

Праўда, некаторыя з гэтых старых паноў надта ўхітрыліся. Перад тым, як Польшча мелася падзяліць асаднікаў зямлёй, яны ўзялі ды прадалі свае маёнткі. Так уладары двара Плянты прадалі яго суполцы купцоў, а ад гэтае суполкі Урад і рэзнуў адразу для асаднікаў 3.500 дзесяцін зямелькі. Суполка за гэтую зямлю не дастала ад Ураду дагэтуль ані воднай марачкі ды яшчэ — мала таго — плаціла ў працягу двух гадоў усе падаткі і за гэтыя 3.500 дзесяцін.

А асаднікі жывуць і нічога ім, жывуць добра. А нам дрэнна, ох як дрэнна. Чакалі, чакалі палепшаньня жыцьця, ды ўжо і надзею пачынаем траціць. Надта-ж цяжка!

Пракук С.

УСХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ.

З Менску.

Зьезд працаўнікоў асьветы. 17-га сакавіка ў Менску адчыніўся Зьезд загадчыкаў Павятовымі Аддзеламі Народнай Асьветы пашыранай БССР.

У першыя дні працы Зьезд заслухаў даклады з мейсц, а таксама даклад Баліцкага—„Грунтоўныя заданьні Народнага Камісарыяту Асьветы“ і даклад Каранеўскага — „Сыстэма асьветы“, якія выклікалі ажыўлёныя спрэчкі з боку працаўнікоў з мейсц. Між іншым, на Зьезьдзе выявілася вялікая розьніца ў правадзімай сыстэме асьветы ў непашыранай БССР і Усходняй Беларусі, чаго ў будучым не павінна быць.

Здавальненьне школаў Усходняй Беларусі беларускімі падручнікамі. Народны Камісарыят Асьветы БССР пасылае для школаў сацыяльнага выхаваньня прылучаемых да БССР тэрыторыяў Гомельскай, Смаленскай і Віцебскай губ. па аднаму экзэмпляру ўсіх беларускіх падручнікаў.

Наагул пасылаецца па 2540 экз. кожнай кніжкі.

Да адчыненьня паветраных зносін між Менскам і Масквой. Згодна з умовай, зробленай між Беларускім Таварыствам Паветранага Флёту і „Добролётом“, апошні бярэ на сябе абавязак у бліжэйшыя месяцы наладзіць паветраныя зносіны між Менскам і Масквой і іншымі прамысловымі раёнамі.

У часе Ніжагародзкага кірмаша будзе ўстаноўлена паветраная лінія між Менскам і Ніжнім-Ноўгарадам.

Сялянская ўзаемадапамога на Беларусі. Да пачатку 1924 г. на Беларусі было 116 валасных і 2114 сельскіх камітэтаў сялянскай узаемадапамогі.

Натуральны фонд сялянскіх камітэтаў да гэтага часу складаў у жытніх адзінках 68,000 пудоў.

За 1923 г. грамадзянскімі сіламі было апрацавана 7.000 дзес. зямлі.

Усяго за год сялянскімі камітэтамі ўзаемадапамогі была зроблена дапамога 25.311 сем'ям.

Беларускі культурны рух у Магілёве.

Гурткі беларусазнаўства адчыняюцца адзін за адным. 9-га сакавіка былі арганізаваны два гурткі: 1) у школе 2 ст. № 3 ім. Леніна і 2) у Пэдтэхнікуме. Гэтыя гурткі захапілі вялікі лік вучняў. У школе № 3 залічылася каля 40 чалавек, а ў Пэдтэхнікуме — амаль сто.

Адчыненьне гуртка ў Пэдтэхнікуме адбылося вельмі ўрачыста. Дырэктар Пэдтэхнікуту Машкоўскі сам адчыніў паседжаньне сходкі прамовай аб мэтах працы гуртка ў супольнай сувязі з мэтамі працы РКП і пастановамі Зьезду Саветаў СССР у нацыянальным пытаньні.

Гурток у Пэдтэхнікуме падзяліўся на 2 часткі. Знаёмыя з беларускай літэратурай утварылі вышэйшую групу (каля 25 чал.). Рэшта 75 чал. увайшлі ў пачатковую групу. На працу ў гэтых групах ахвярована па дзьве гадзіны ў тыдзень. Кіраўніком будзе настаўнік беларусазнаўства Д. І. Доўгала. За старшыню гуртка застаўся выбраны студ. 3 курсу Арлоўскі.

Гурткі беларусазнаўства павінны адчыніцца ў Мэдтэхнікуме і Тэхнікуме Індустрыяльным. У Мэдтэхнікуме зарганізаваўся ўжо беларускі хор і выступае пад кіраўніцтвам Мартынава.

Адчынены 1-га сакавіка гурток беларусазнаўства пры клюбе Працаўнікоў Асьветы, які працуе рэгулярна.

7-га сакавіка адбыўся сход гуртка вышэйшае групы. Павестка дня: азнаямленьне з культурна-асьветнымі дасягненьнямі Бел. С.С.Р. за тры гады яе істнаваньня. Даклад зрабіў Жураўскі, а судаклад—Даўгала.

10-га сакавіка наладзіла сход першая група гуртка. Сход быў ахвяраваны чытаньню пабеларуску.

Пасьля лекцыі аб гуках беларускае мовы і некаторых правілах правапісу, былі прачытаны творы белар. пісьменьнікаў Якуба Коласа, Янкі Купалы і іншых і з газэты „Сав. Беларусі“—навейшы нумар.

Адгэтуль відаць, што ўжо магчыма і вельмі патрэбна ў Магілёве адчыніць курсы беларусазнаўства.

Д. Д.

З Віцебшчыны.

Сяляне аб далучэньні да Сав. Беларусі.

(Ленінская вол., Полац. пав.).

1-га сакавіка ў клюбе ім. Леніна адбылася шырокая сялянская канфэрэнцыя, на якой прысутнічала 300 чалавек.

Між іншымі пытаньнямі быў зроблены даклад аб далучэньні Віцебшчыны да Сав. Беларусі.

Пасьля дакладу аб далучэньні сяляне задавалі пытаньні аб тым, як будуць школы, на якой мове будуць вучыць дзяцей, на якой мове будуць друкавацца газэты, дзе будзе цэнтр і г. д. На ўсе запытаньні даваліся поўныя адказы.

Шмат хто з старых сялян гаварыў:

— Ага! Усё-ж такі і мы, беларусы, маем сваю рэспубліку.

Сяляне шчыра згадзіліся з палітыкай Савецкай улады аб далучэньні да Сав. Беларусі.

С. С.

Ленінскае т-ва служыўцоў.

(Ленінская вол., Полацк. пав.).

З кожным днём тавары ў нашым каапэратыве таньнеюць. Селяніну робіцца шмат лягчэй, бо за збожжа ён цяпер можа куды больш купіць, чымсь раней.

Нядаўна адбыліся перавыбары праўленьня, дзе быў заслухан даклад праўленьня і рэвізыйнай камісіі.

Працу праўленьня пахвалілі і вынесьлі ўдзячнасьць Бельскаму і Гайбуту, якія патрапілі разьвіць каапэрацыю з трох пудоў хлеба і завербаваць 112 пайшчыкаў, а таксама патрапілі перамагчы спэкулянтаў.

Стары склад праўленьня пры перавыбарах астаўся працаваць і надалей.

Сьцяпан Чуткі.

Ад Беларускага Т-ва помачы пацярпеўшым ад вайны.

Надыходзіць вясеньняе Сьвята-Вялікдзень.

Рады сьвяту—хто мае дзе і з кім (сярод радні, сярод мілай кампаніі) правясьці гэнае сьвята і павесяліцца, хто мае што сытнейшага і смачнейшага спажыць, хто мае ў што новае прыадзецца.

А ёсьць такія, што з трывогай спаглядаюць на блізкае Сьвята, бо як сіроты і бедныя-бедныя—ня маюць ад каго з радні спадзявацца мілай перамены ў іх страшэнна ўбогім, адзінокім, нудным жыцьці. Такіх ёсьць у беларускім прытулку аж замнога.

Хоць чым-небудзь і хоць некалькім з іх трэба дапамагчы, зрабіць ім сьвята мілейшым, каб, дачакаўшы сьвята, дачакацца спакою душы, што частачку грамадзкага абавязку выканалі,—частку сіроцкай і бядацкай долі аблегчылі.

Каб сьвята—Вялікдзень міла было бедным сіротам успомніць і правадзіць, Камітэт заклікае далучыцца да агульнай складчыны на бедных сірот-вучняў.

Камітэт.

Дырэкцыя Беларуск. Драматычнае Майстроўні

зварачываецца да ўсіх грамадзян, для каго дарагэ адраджэньне ў Заходняй Беларусі беларускага тэатру, з гарачай просьбай дапамагчы Таварыству сабраць патрэбны для сцэнічных прадстаўленьняў тэатральны рэквізыт.

Усе тыя рэчы ў хатнім жыцьці, якія ўжо сваё адслужылі і больш ня ўжываюцца, прысылайце, грамадзяне, да нас (Вострабрамская, № 9), мы прымем іх з шчырай падзякай, як вельмі патрэбныя рэчы на сцэне.

Т-ва просіць прысылаць: кашулі, хусткі, нагавіцы, лапці, камізэлькі, сьвіткі, гунькі, посьцілкі, паясы, шапкі, лыжкі, місы, палонікі, люлькі, кажухі, торбы, пугі ды інш.

Грамадзян падпішчыкаў газэты „Голас Беларуса“, якія яшчэ не надаслалі падпіскі на красавік месяц, просімо пасьпяшыцца, каб ня было перарыву у атрымліваньні газэты.

Адміністрацыя.

Рэдактар-Выдавец М. Шыла.

Друкарня Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.